У НУМАРЫ:

Нататкі вахцёра 2 | Апошняя надзея 2 | Размышления о тоталитаризме 3 | Будущее страны — молодежь 3 | Программа телевидения 4

№19
9 верасня 1994 г.
пятніца
Кошт 20 руб.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ГАЗЕТА

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ

Сцежкі Радзімы

У истоков вечности

Алексей КУЗЬМИЧ:

"... Я за то, чтобы в Минске организовать славянский клуб, где бы могли собираться художники, поэты, композиторы... вся творческая интеллигенция, деловые люди. Где можно было бы выставлять картины, образцы народных ремесел, петь песни, читать стихи, слушать музыку... Это действительно был бы как раз тот клуб, который послужил бы началом целого общественного движения, та энергетическая точка, та аккумуляторная батарея, которая бы подзаряжала нашу интеллигенцию, придавала ей новые силы, сближала и объединяла нас, славян... Поэтому я обращаюсь к президенту Александру Лукашенко, Совету Министров, председателю Минского горисполкома — помогите нам в этом благородном деле!.."

---- Алексей! В книге отзывов я прочел такую запись: "Хочется приходить и приходить на Вашу выставку. Это чудо, это божий дар. Как хорошо было бы, чтобы мы имели в Белоруссии помещение или галерею, и чтобы собраны были под одной крышей Ваши работы. И когда на сердце тяжело, душа просится к свету, видеть Ваши работы просто счастье... Храни и помоги Вам Бог!.."

Вы понимаете, это высокая оценка даже для художника с мировым именем. И хотя Ваши картины заслуживают самого пристального внимания, все же наш разговор мне бы хотелось начать несколько с другого, а именно о позиции художника в современном мире, художника ---- гражданина с большой буквы, который не отделяет себя от своего народа, а живет с ним одними бедами и радостями, является его выразителем и повадырем, как было это из века в век у любого народа, в том числе и у нас.

Не так давно Вы, по приглашению россиян, участвовали в коллективной выставке в Санкт-Петербурге. Скажите, что это была за выставка, и почему именно только Вас одного из Беларуси пригласили в ней участвовать!

— Называлась она "Душа России". Это была очень мощная выставка. Пожалуй, по своему внутреннему звучанию, целям и задачам она не уступала, а то и превосходила выставку передвижников. И это не преувеличение. Объявилась целая группа художников, которая через душу и сердце, через идеалы добра и света, нравственные православные законы, нашу историческую соборность, через свое творчество решила помочь восстановлению, спасению нашего славянского Отечества...

Меня пригласили как художника, который пишет Мадонн. Сегодня мало кто берется за такие сложные работы. Выделили центральный зал в здании бывшего Императорского общества поощрения художеств, которое когда-то построил сам император Александр I. Это рядышком с Эрмитажем и Исаакиевским собором. Конечно, я этого не ожидал. Нашу выставку освятили два митрополита, были певчие... Такого не было за последние 76 лет...

Многое дали нам общения, встречи... Помню, один ленинградский художник, да, ленинградский, я не ошибся, потому что он вырос в этом городе и образование получил здесь же, все время толдычит: "мы будем через душу и сердце...". А меня злость берет. До каких же пор русский народ будет поражать всех своей великой наивностью, граничащей с вопиющей безответственностью перед всем славянским миром. Не сдержался и говорю: "душа, сердце ..." у нас, славян, все это есть. Нет того, что может защитить это сердце и эту душу... Нашу духовность в целом. Не выработали славянская сердобольная цивилизация и православие функцию самозащиты от наглости, предательства и пакостников в собственном доме... Я, белорус, потрясен: как только чисто русский, так обязательно обворованный, какой-то задрипанный, полуголодный, забитый...

С ведома правительства идет деградация тела и духа. Но разве справедливо такое?!.. Захожу в русский национальный музей., где великое русское искусство собрано, а там какие-то выставки картин 20—30-х годов, и ни одной русской фамилии. Ни одного русского человека нет в русском музее... Я вырос и воспитывался на великой русской культуре и потому с такой болью воспринимаю все это.

Конечно, я задавал вопрос, чувствуют ли русские нашу ответственность за трагедию 1917 года?.. Что может ответить художник? Конечно, да! Но не только одни русские виноваты во всем. Когда тем же русским говорят, что Москва и Петербург — это не их города, что это уже общеевропейские селения... Поэтому правильно некоторые говорят, что спасение России в малых городках, где когда-то и Минин с Пожарским появились.

Мы, белорусы, конечно же, частица великой Славянской цивилизации и не должны быть в стороне в битве тьмы и света, добра и зла за наши души. Поэтому, когда на пресс-конференции вслед за главным докладчиком мне дали слово, я сказал: наша главная задача найти в себе силы и объединиться. Как на поле Куликовом, под Бородино, как в 41-м и 45-м... Ибо страшная, беспощадная битва идет всеми мыслимыми и немыслимыми способами за опустошение наших душ... Не дубьем махать, говорю, а осознать, что происходит, вот что главное. Посмотрите, говорю, уже сейчас с этого года у вас обязательное среднее образование стало только девять классов. Ни Богу свечка, ни черту кочерга... Это для того, чтобы больше холуев-недоучек новоявленным богатеям было... Смотрю, в зале на лицах у некоторых появилась этакая ехидная ухмылочка. Но я так горячо и убежденно говорил, что сбить меня им не удалось...

Пусть ухмыляются! Я выкроил время и четыре дня провел в Эрмитаже среди великих художников: Тициана, Веласкеса, Рембрандта... Здесь я окончательно понял: самое величайшее достижение мирового искусства будет именно в России, на Украине и в Белоруссии. Это будет XXI век, когда исстрадавшаяся славянская нация осознает величайшую трагедию, произошедшую с ней за всю историю существования человечества, потому что 150 миллионов славян было истреблено по злой, чуждой им воле...

---- Алексей. А что же сейчас! Что это за люди, которых Вы называете врагами России, а, стало быть, и Вашими врагами!

— Это те, кому чужды прежде всего интересы нас, славян. Кому чужды интересы Беларуси, России, Украины, которые больше патриоты той же Америки, Израиля, Германии... У кого шея повернута на Запад, но хлеб едят наш, и наживаются за счет нас, на нашем несчастье...

И вот когда творцы — музыканты, поэты, художники и т.д. осознают все это, начнут прозревать и другие.

---- Так кто же мы, какая наша задача!

— Мы в данный момент как перекидной мостик между прошлым и будущим, мы несем свечу духовности. И очень важно, чтобы в наших руках она не погасла. Мы обязаны донести ее и передать тому поколению, которое в следующем веке, может быть, будет и гораздо умнее, талантливее, и главное — принципиально патриотически настроенным, которые не предадут. Не все же продадутся за шоколадку или жевательную резинку...

---- Алексей! А сейчас кто-нибудь хоть интересуется Вашим творчеством, или оно уже в самом деле никому не нужно!

— Ко мне приходили каждый день разные люди, в том числе и о цене спрашивали. Предлагали даже организовать международную выставку. Но это были не наши люди. У нас, славян, нет мирового капитала. У кого он есть, тот и заказывает музыку. Вот и скупают нас за бесценок, будь ты хоть трижды гением...

Я же видел другие работы в "свободной Америке". Пять миллионов холст стоит, а я хохочу возле него. Они соглашаются... Говорят, Алексей Васильевич, мы понимаем, но тебя не знает Америка. Мы тебе не можем больше дать. Так, пару тысяч... А "эти" пять миллионов стоят. Я видел "их", многометровые, в Метрополитене, крупнейшем музее мира. Краской полотна облиты, шваброй потерты. Там же табличка висит — пять миллионов долларов...

Они же ограбили наши музеи! Особенно после 1917 года. Кто подсчитал, сколько и куда было вывезено наших полотен, вообще всевозможных художественных ценностей, изделий из серебра, золота, старых икон?..

Окончание на 3-й стр.





ПУЛЬС

БЕЛАРУСЬ

ЗІМОВЫ ЧАС ПРЫЙШОЎ

25 верасня пераводам гадзіннікавай стрэлкі на адну гадзіну назад будзе ажыццёўляны пераход на зімовы час. У распараджэнні кіраўніка апарату Кабінета Міністраў гаворыцца, што гэта рашэнне прынята ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў ад 25 сакавіка 1992 года "Аб парадку вылічэння часу на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь".

Адначасова з пераводам гадзіннікавых стрэлак, пэўна, трэба запытаць у якога-небудзь знакамітага астролага: а на колькі дзірак перавесці нашы рамяні?

ДОЛГ ПЛАТЕЖОМ КРАСЕН

Как заявил на пресс-конференции вице-премьер правительства Михаил Мясникович, "долг Белоруссии России за энергоресурсы составляет 733 миллиарда российских рублей, однако это долг хозяйственных субъектов, а не государства". Коментируя сумму задолженности, он отметил, что она равняется четверти валового национального продукта республики за полгода.

НЕ ВСЕ ЛУГА ПОКОШЕНЫ

Второй укос трав не успокоил специалистов Минсельхозпрома. По состоянию на 5 сентября объем заготовленных травяных кормов оказался на 30—35 процентов ниже, чем за аналогичный период прошлого года. Всего, по последним данным министерства, в хозяйствах республики заготовлено в процентах к плану: сена — 71 (2 миллиона 529 тысяч тонн), сенажа — 78 (5 миллионов 817 тысяч тонн), травяной муки — 60 процентов (69,2 тысячи тонн). В пересчете на кормовые единицы запасено 58 процентов от плана (3 миллиона 319 тысяч тонн). Принимаются меры для активного использования при заготовке кормов несельскохозяйственных угодий — пустошей, пойм рек, заболоченных участков, лесных опушек и т.д.

ЛЕС РУБЯТ — СРОКИ ЛЕТЯТ

Завершилась ревизия областных лесохозяйственных объединений. Она подтвердила многочисленные факты злоупотреблений торговли лесом. Прокуратура республики возбудила уголовное дело. "Раскрутка" началась с подачи членов президентской команды, которые занимаются вопросами коррупции. Несколько раньше в соответствии с президентским указом лишился своего поста бывший министр лесного хозяйства Георгий Марковский, в действиях которого усматривается злоупотребление служебным положением и халатность, в результате чего государству нанесен значительный урон. Как говорится, дыма без огня не бывает. Интересно, попадут ли в этот костер только щепки, или к министерскому бревну добавятся и другие колоды? Полыхнет ли весь "лес", вопрос риторический.

МІЖНАРОДНЫ АДУКАЦЫЙНЫ ЦЭНТР

Праблемы правоў чалавека ў сучасным грамадстве, нацыянальнай самасвядомасці і культуры, ролі рэлігіі у сённяшнім свеце абмяркуюць удзельнікі Міжнароднага адукацыйнага цэнтра, які толькі што адчыніў свае дзверы на праспекце газеты "Правда" у Мінску. У ім прымаюць удзел навукоўцы, дзеячы культуры, святары і лідэры дэмакратычных рухаў дзвюх краін — Беларусі і Германіі. Адкрыццё кангрэса па шчаслівай выпадковасці супала з адкрыццём самога цэнтра. У аснову праекта пакладзены адзін з малюнкаў вядомага мастака Казіміра Малевіча. Ідэя праекта і фінансаванне будаўніцтва з беларускага боку належыць акцыянернаму таварыству "Спадарожнік". З нямецкага боку яго фінансавалі ўлады фэдэральнай зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія, акцыянернае таварыства "Фольксваген" і Евангелістычная царква.

Василий РОМАНЕНКО

БЫЛІ СТУДЭНТЫ — СТАНУЦЬ САЛДАТЫ?

Каля паловы ўсіх ваенных кафедраў, існуючых сёння ў розных ВНУ рэспублікі, відаць, у хуткім часе будуць скасаваны. Звязана гэта з тым, што ў мабілізацыйным рэзерве колькасць ваенных спецыялістаў вельмі ўжо перавышае патрэбы ў іх Міністэрства абароны. Да таго ж падрыхтоўка на ваенных кафедрах праводзіцца па старой праграме, не адпавядае патрабаванням сённяшняга дня.

З канкрэтнымі прапановамі па рэфармаванні ваенных кафедраў ваеннае ведамства выступіць перад Кабінетам міністраў вясною будучага года. У гэтым жа навучальным годзе вырашана пакінуць усё без змен. Ну а афіцэры, якія працуюць на ваенных кафедрах, атрымалі дадатковы тэрмін на пошукі новага месца працы. Студэнты ж, падобна на тое, могуць рыхтавацца да службы ў войску...

Сяргей ВІШНЕЎСКІ

БЛІЗКАЯ ВАКОЛЦА

ГАЙДАР ШАГАЕТ ВПЕРЕДИ

На арену политической жизни вышла новая партия "Демократический выбор России" — первая партия крупной буржуазии. Во главе ее — Егор Гайдар, который планирует в будущем еще больше сократить влияние государства на экономику и социальную сферу. Он против "заводского социализма", то есть той социальной помощи, которую еще оказывают предприятия своим труженикам. Главная забота Е.Гайдара — добиться гарантии для частной собственности, перевести экономику на капиталистические рельсы. Выступая за "рынок" так же рьяно, как когда-то выступал за коммунизм, "крестный отец" новой буржуазной партии не учитывает только одного — того образа, который он обрел в глазах миллионов обездоленных.

БАНК ЖИЗНИ УМИРАЕТ

Банком жизни называют известный во всем мире Всероссийский институт растениеводства им.Н.И.Вавилова, созданный около 100 лет тому назад. Это единственный в мире генный банк, в котором хранится более 300 тысяч семян растений, бесследно исчезнувших с лица Земли. Сегодня этот банк-уникум погибает: нет средств на нормальное содержание коллекций, достойную оплату труда сотрудников, организацию экспедиций. Такого обращения с достоянием всего человечества не вынес даже вице-президент США Альберт Гор. Благодаря ему институт получил недавно полмиллиона долларов для ремонта фондохранилищ.

ОТ ВЫБОРОВ ДО ВЫБОРОВ

Центральная избирательная комиссия Украины приняла постановление назначить повторные выборы народных депутатов в 52 избирательных округах, где ранее проводившиеся выборы признаны несостоявшимися или депутат не был избран, на воскресенье, 20 ноября.

РУССКИМ СНОВА ОТКАЗАЛИ

Парламент Молдавии принял статью 13 новой Конституции "Государственный язык. Функционирование других языков". Вопреки сопротивлению прорумынских национал-радикалов государственным языком утвержден молдавский, а не румынский. Русскому языку отказано в официальном статусе. Ныне действующее законодательство о языковом режиме, предусматривающее право граждан обращаться на русском языке в государственные учреждения, остается в силе.

КАЗАХСТАН ТЕРЯЕТ МНОГОЦВЕТЬЕ

Рост численности коренного населения республики при сокращении числа русских, украинцев, немцев — такую четкую демографическую тенденцию выявил Госкомстат Казахстана, который опубликовал свою очередную сводку. Согласно ее данным, с 1989 года русских в республике стало меньше почти на 200 тысяч, украинцев — без малого на 40 тысяч, немцев — на 344 тысячи.

В ДОЛГАХ, КАК В ШЕЛКАХ

Тема внешней задолженности приобрела в последнее время новую актуальность. К 1985 году СССР в этом отношении находился в числе наиболее благополучных стран. "Горбостройка" привела к резкому обострению дефицита государственного бюджета. России в качестве правоприемницы СССР приходится решать проблему обслуживания его внешнего долга. Это стоило ей в 1991г. 12,5 миллиардов долларов, в 1992г. — 15,6 миллиардов. В 1994г. сумма причитающихся с России платежей по всем долгам составляет 32,5 миллиардов долларов.

НАГРУБИЛ УЧИТЕЛЮ — ПЛАТИ

Борясь за образцовую дисциплину учащихся, одна из новоиспеченных саратовских гимназий ввела шкалу денежных штрафов за каждую провинность. Устроил в корридоре свалку — плати тысячу рублей, нагрубил учителю — раскошеливайся еще на одну тысячу, закурил на перемене — еще одну. Разбрасывание хлеба в столовой обойдется в 800 рублей, за лузгание семечек на уроках придется выложить 500 рублей. Напоминая об этом в самом начале учебного года, гимназическое начальство намекает, что материальные санкции могут быть применены и к тем, кто не будет посещать родительские собрания.

За радком Праграмы

НАУКЕ — ПЕРВОСТЕПЕННОЕ ЗНАЧЕНИЕ

Не обижайтесь за правду, но наука и все, что к ней относится, в Программе оказались на роли пасынков. Не учтены, например, особенности Беларуси в этом отношении. Ведь, по сути дела, у нас ввиду отсутствия значительных сырьевых, энергетических и других ресурсов, главной опорой для развития науки является интеллектуальный потенциал.

Поэтому я предлагаю убрать из Программы маловразумительное положение об "адекватном отношении к науке со стороны государства". Вместо этого включить положение о том, что РПТС считает стратегической государственной задачей немедленное и решительное приостановление дальнейшего разрушения интеллектуального потенциала Беларуси, его сохранение, возрождение и развитие.

Предусмотреть также, что нельзя экономить на науке и важнейшей задачей государства должно стать недопущение дальнейшей "утечки мозгов" за рубеж. А вообще-то, если вести речь о перспективах развития науки, надо добиваться того, чтобы люди науки стали одной из самых высокооплачиваемых категорий работников.

С.ПАЩЕНКО,
научный сотрудник, г.Минск

НЕТ! — ТОРГОВОЙ МАФИИ

А нельзя ли включить в Программу положение о защите уже созданных и успешно действующих крупных хозяйств? Мне кажется, что колхозам и совхозам либо группам их можно было передать на баланс все местные заготовительные и перерабатывающие предприятия и организации. Наверное, следовало бы ввести организованную закупку готовой, т.е. уже переработанной сельскохозяйственной продукции, что позволит резко сократить объем государственных дотаций и поднимет заинтересованность в наращивании производства. А то ведь очень неладно пока что получается: сельские труженики самоотверженно трудятся на полях и фермах, выращивая зерно и картофель, производя молоко и мясо. Но закупочные цены очень низкие, а переработчики-посредники и торговые работники безбожно "накачивают" цены и обирают честных тружеников и городских, и сельских. Пора положить конец этой перекупочно-торговой мафии.

А.ВАЩИЛА,
домашняя хозяйка, г.Гомель

НЕ ЗАБЫВАЙЦЕСЯ ПРА РАСІЮ

Літаральна кідаецца ў вочы, што раздзел "Знешняя палітыка" падрыхтаваны без уліку апошніх змяненняў у геапалітычным становішчы Беларусі. Нічога няма, напрыклад, адносна таго, што асновай знешняй палітыкі нашай маладой дзяржавы з'яўляецца цеснае супрацоўніцтва з Расіяй, брацкая дружба з родным нам рускім народам. Аб гэтым стала гаварыць у сваіх афіцыйных прамовах і інтэрв'ю прэзідэнт А.Р.Лукашэнка. Нельга не ўлічваць гэтага! Не згодзен вось яшчэ з такім сцвярджэннем: "адносіны з дзяржавамі далёкага замежжа будуць азначацца пераходам ад культурна-асветніцкай дыпламатыі да дыпламатыі эканамічнай". Як жа гэта разумець? Ці ж толькі ў культурна-асветніцкай дзейнасці справа? Нельга адхрышчвацца ад сумесных палітычных дзеянняў і заяў. І апошняе, што трэба адзначыць. У апошні час вельмі шмат увагі надаецца ўз'яднанню, у першую чаргу, трох адзінакроўных славянскіх народаў — рускага, беларускага і ўкраінскага. Дык, мо, у Праграме недзе, напрыклад ва ўступным раздзеле, трэба штосьці адзначыць пра ўз'яднанне славянства?

П.ВАШКЕВІЧ,
урач-тэрапеўт, г.Гомель

КЛАПАЦІЦЦА АБ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ

Мне вельмі падабаецца, што першачарговай задачай партыі вызначаецца сацыяльная абарона тых грамадскіх груп і слаёў насельніцтва, якія знаходзяцца ў найбольш цяжкіх умовах жыццяздольнасці — пенсіянеры, дзеці-сіраты, інваліды і г.д. Як гэта добра, што дзяржава будзе клапаціцца аб гэтых катэгорыях сваіх грамадзян. У сувязі з гэтым уношу прапанову запісаць у раздзеле "Сацыяльная палітыка" наступнае: "Клопаты аб грамадзяніне, яго духоўных і іншых патрэбнасцях з'яўляецца натуральным і неад'емным абавязкам дзяржавы. Дзяржава не мае права ні пры якіх абставінах пакідаць сваіх грамадзян на волю лёсу, самаўстраніцца ад вырашэння іх сацыяльных праблем, парушаць свае абавязкі перад грамадзянамі і знімаць з сябе адказнасць за іх далейшы лёс".

І.ВАРАНОВІЧ,
настаўнік-пенсіянер, г.Полацк

НУЖНЫ СОЦИАЛЬНЫЕ ГАРАНТИИ

Видимо, надо значительно переработать раздел "Социальная политика", больше сказать о необходимых социальных гарантиях для человека труда и представителей слабо защищенных в этом отношении социальных групп и слоев. На мой взгляд, эти гарантии сводятся прежде всего к праву на труд, на бесплатные государственные образование, здравоохранение и социальное страхование и т.д. Первая часть этого раздела, по моему разумению, должна звучать примерно так: "государство должно гарантировать всем своим гражданам право на труд, возможность трудоустроиться, а в случае потери работы должны быть обеспечены соответствующие социальные гарантии и возможности переквалификации".

Я.ПАХОМЧИК,
врач, г.Брест

УМАЦОЎВАЦЬ СЕМ'І

Нядаўна я прачытала ў газеце (здаецца, ў "Звяздзе") аб тым, што ў апошні час распадаецца каля 70 працэнтаў створаных сем'яў. Гэта, безумоўна, трагедыя, тым больш, што ў шлюб часцей за ўсё ўступаюць маладыя людзі. Таму лічу, што вы дарэчы гаворыце ў Праграме аб уласцівых некаторай частцы моладзі бездухоўнасці і спрошчаных адносін да жыцця. У нас з мужам вялікая і дружная сям'я, мы выхавалі ажно шасцёра дзяцей. Тры з іх ужо маюць свае сем'і, і ніхто яшчэ не разводзіцца. А зараз, як правіла, у сем'ях па аднаму, зрэдку — па двое дзяцей. Гэта ж можа хутка прывесці да вымірання беларускай нацыі. Таму прапаноўваю ў раздзел "Сацыяльная палітыка" ўнесці некаторыя дапаўненні. Напрыклад, патрэбна адзначыць, што РППС будзе змагацца за стварэнне дзяржаўнай праграмы ўмацавання сям'і, увядзенне ў дзеянне законаў па абароне мацярынства і дзяцінства, стымуляванне нараджальнасці і г.д.

Н.САЛАВІНСКАЯ,
былая настаўніца, зараз хатняя гаспадыня, г.Віцебск

Хлеб надзённы

АПОШНЯЯ НАДЗЕЯ

Міхалкаў пляменнік Слаўка на добрым падпітку сеў на матацыкл і збіў вясковую дзяўчыну. Слаўку арыштавалі, а яго ахвяру завезлі ў цяжкім стане ў Мсціслаўскую раённую бальніцу. Амаль у той жа час такі ж выпадак здарыўся ў суседняй вёсцы Сялец. Пьяны сын загадчыцы сельмага зноў жа на матацыкле наехаў на 14-гадовую дачку калгаснага жывелавода, якая памерла ад цяжкіх траўм на месцы здарэння.

Міхалку нескладана ўявіць сабе, што творыцца цяпер у душы бацькоў ахвяр п'янчуг. Яму і самому не пашчасціла на сына. За злоўжыванне горкай старшыня калгаса мусіў звольніць хлопца з фермы. Пры сённяшнім развале эканомікі знайсці новы занятак няпроста. Ды зрэшты ён і не стараецца: сядзіць на шыі роднай бабы Хімы. Міхалка наадрэз адмовіўся карміць аматара гарэлкі, адправіў, як кажуць, з роднай хаты на ўсе чатыры бакі. А сэрца ные, сохне нутро... Нязвыкла цяжка і ад таго, што няма пакуль патрэбы ў яго дабітым на калгасных палетках трактары. Міхалка рады любой працы на машынным двары або ў свірне. Як-ніяк, а тысяч трыццаць выйдзе. Будзе на хлеб, і на селядзец можна выкраіць: да яго Міхалка дужа ахвочы. На большае не разлічвае. Дзякуй Богу, бульба і агуркі свае, а малака — ажно залішне. То злівае свінням у карыта, хаця і грэх гэтак рабіць. На жаль, іншага выйсця няма, бо ніхто цяпер не збірае тое малако, А без каровы было б зусім блага. На вёсцы без яе ніяк не абысціся. Свае сырадой і смятана, нядоўга сохне без справы ў куце маслабойка... А для кароўкі трэба ўлетку назапасіць не менш трох тон сена. З клопатам Міхалка справіўся паспяхова. Тры тоны з гакам склаў у пуні. А што не ўлезла — раўнютка прычасаў у пабялелым на сонцы стажку. Сёлета праўленне калгаса шчодра выдзяліла сенажаці на заліўных лугах за Сожам. Не прападаць жа разнатраўю, калі калгасны статак рэзка зменшыўся.

Да павароту ў сённяшні капіталізм Міхалку б не прысніўся і ў дурным сне цяперашні развал. Прыкра, што колішнія вясковыя гультаі і п'яніцы жывуць сабе — не тужаць. Разоў пяць на месяц злетаюць праз Сож з мяхамі хлеба на Смаленшчыну і потым хваляцца даволі важкаю ў параўнанні з тутэйшымі "зайцамі" расійскай валютай. Браць з іх прыклад Міхалку не дазваляе "камуністычнае" выхаванне, хаця членам "кіруючай і натхняючай" не быў ніколі.

Хімін Міхалка хлебароб ад Бога. Таму Хімін, што бацьку свайго Ягора не помніць. Яго забілі, калі Міхалка быў дзіцём. Старая цяпер і хворая Хіма адна не горш за іншых выхавала ў свой час двух сыноў і дачку, дачакалася нават праўнукаў. І не яе віна ў тым, што набыткі цяжкай калгаснай працы сёння практычна ідуць прахам. Ёй не менш за Міхалку балюча бачыць, як зарастаюць пустазеллем палі славутага некалі калгаса імя XXI з'езда КПСС на чале з былым старшынёй Героем Сацыялістычнай Працы Андрэем Шакурам. Цяперашняе кіраўніцтва гаспадаркі старая Хіма, як і яе сын Міхалка, асабліва ні ў чым не вінавацяць. У іх хапае розуму ад матухны-прыроды, каб разабрацца ў прычынах сённяшняй эканамічнай драмы. Дзякуй Богу, што пры ўсіх сваіх складанасцях калгас не забывае пра пенсіянераў. Адгукаецца на ўсе магчымыя просьбы і імкнецца іх задаволіць. Адзінокай старой Зене па распараджэнню старшыні нават завезлі сёлета дровы. Не абдзелены ўвагай і працаздольныя калгаснікі. Сам Міхалка, напрыклад, пастаянна выпісвае зерне для адкорму свіней на падворку і адмовы ў тым не мае.

Міхалку, як і яго маці, больш за ўсё палохае магчымасць канчатковага развалу гаспадаркі. Тады ўжо не даводзіцца разлічваць на чыюсьці дапамогу. А самастойна гаспадарыць пры сённяшняй эканамічнай сітуацыі на вёсцы сялян пакуль не вабіць. Сам Міхалка адсутнасць жадання паспытаць фермерскага хлеба тлумачыць тым, што за трыццаць з гакам гадоў працоўнага стажу ў калгасе ён капіталаў не нажыў. Зямля ж мае патрэбу ў пастаянных укладаннях і руплівай працы. Аднаму з гэтым ніяк не справіцца. Тым больш, што на сяле цяпер сапраўдных земляробаў засталося мала. А моладзь больш глядзіць у чарку і лётае па вёсцы на матацыклах... Не разлічвае Міхалка і на дзяржаўную подтрымку. Міхалка звыкся за жыццё з тым, што патрабавалі ад яго рабіць на ўсю моц і мала што давалі ўзамен. Акрамя сціплай зарплаты. Падзяк, праўда, да розных свят хапала, аднак радасці ад іх было няшмат. Між тым, як кажуць, на жыццё хапала. А хто не кідаўся капейкай, дык меў грошы. Сусед Міхалкі, трактарыст Мікалай Грыбкоў, да так званай перабудовы меў на кніжцы ажно 20 тысяч рублёў. Па тым часе больш чым на дзве легкавушкі! Але ляснулі цяпер працоўныя грошыкі Мікалая. Хаця і не Міхалкавы грошыкі, а ўсё ж шкада. Сам, праўда, ён збіраць іх не спрабаваў, траціў на дзяцей і гаспадарку. У Міхалкі не калгасны, а асабісты, самім пабудаваны дом, хлеў для свінней і каровы, гараж для матацыкла. Хопіць на сваё жыццё і дзецям застанецца.

Слухаючы па радыё праклёны калгасна-саўгаснай сістэме з вуснаў рэфарматараў, Міхалка мацюкаецца. Яго да глыбіні душы абураюць дурнота і нахабства "асфальтавых аграрнікаў". Яны, на думку трактарыста, нічым не лепш за тых ранейшых "камунякаў", што блыталіся пад нагамі хлебаробаў з "каштоўнымі" парадамі адносна таго, калі жаць, што і як сеяць. Аднак для такіх Міхалка заўсёды трымаў кукіш у кішэні і рабіў па-свойму. З гора-рэфарматарамі справы абстаяць горш. Жадаючы таго ці не, яны ўшчэнт развальваюць не імі створаныя гаспадаркі і заганяюць у галечу земляробаў. Міхалка плюецца ў такім разе на чысцюткую падлогу, пхае ботам ні ў чым не вінаватага ката і з новым мацюком выключае насценны дынамік. Затым кіруе на дрывотню і бярэцца за самыя тоўстыя цельпукі, малоціць сякерай пакуль не ўзапрэе і не супакоіцца. Дастаецца тым часам і жонцы. Са сваім "камуністычным" выхаваннем Міхалка ў іншых, па яго выразу, буржуйскіх сродках патрэб не мае. Гэта ледзь не каштавала яму некалі канчатковага разводу з вострай на язык Маняй. Цяпер, дасць Бог, такога ўжо не здарыцца. Трэба дажываць нядоўгі чалавечы век разам: гэтак лягчэй і спакайней. Калі занядужыць нехта з іх, дык будзе каму падаць шклянку вады. А старасць, па нашым часе, чакаецца нялёгкая. Старэйшая дачка нарадзіла дзяцей і жыве за многія вёрсты ад роднай хаты ў сваім доме. Не заседзіцца ў дзеўках і малодшая прыгажуня. Няма спадзеўкі і на сына, калі той будзе піць горкую і снoўдацца бугаём па вёсцы. Застаецца адна надзея на сябе і на калгас. На жаль, на адпушчаны лёсам век здароўя не набрацца. Турбуюць радыкуліт, артрыт суставаў. Недалёка, мусіць, той час, калі Міхалку з жонкай, як і большасці старых, спатрэбіцца дапамога калгаса. Калектыў гаспадаркі па-ранейшаму — апірышча ўсіх нямоглых і пенсіянераў. Нават у апошні шлях дапаможа родзічам правесці.

Пры ўсіх складанасцях у маладых усё ж ёсць нейкі выбар, а такім, як Міхалка і яго аднагодкам, застаецца адно: дажываць век у калгасе і спадзявацца, што гэта іх апошняе апірышча не разваліцца канчаткова пад ударамі тых самых гарластых "асфальтавых аграрнікаў".

Віктар САХАНКОЎ

Ад рэдакцыі. *Нашаму пастаяннаму аўтару журналісту Віктару Саханкову споўнілася пяцьдзесят гадоў. Рэдакцыя "Цэнтральнай газеты" шчыра віншуе Віктара Аляксеевіча з гэтай датай і надалей жадае яму творчага натхнення.*

Набалела!

БУДУЩЕЕ СТРАНЫ — МОЛОДЕЖЬ

Тяжело сегодня всем. Но особенно трудно молодежи начинать свою самостоятельную жизнь. Как создать и обеспечить семью, когда цены мчатся резвее орловских рысаков, а купить жилье под силу только тем, кто успел сколотить капиталец, неважно каким путем. А если у кого дети? Как быть, как жить? Сидеть на шее у родителей, на детство которых выпала война, а на старость — перестройка? Но им самим впору идти на паперть. И с грустью вспоминается доперестроечный лозунг: "Молодым везде у нас дорога, старикам везде у нас почет". Да ведь было же время...

Какую дорогу сейчас выбрать молодежи? А если захочется учиться, как прожить на стипендию, а если еще придется платить за обучение? Да и есть ли гарантия после окончания устроиться на работу? Гарантии нет! За первое полугодие этого года в Беларуси зарегистрировано 83,4 тысячи безработных, среди них 3,6 тысячи молодых специалистов (выпускников ПТУ — 2 тысячи, техникумов — 1,2 тысячи, вузов — 0,4 тысяч). 70% из них составляют женщины. Удалось устроить только 20%, остальным нет вакансий. Особенно тяжело с трудоустройством минчан и брестчан.

Директор Минского городского центра занятости населения Стукач Н.С. считает сложившуюся ситуацию парадоксальной: безработные есть, а безработицы нет. В Минске 10 тысяч безработных и 10 тысяч вакансий. Но какие? В основном физический, неквалифицированный труд. Пройдет год, два, и молодой специалист потеряет квалификацию. Все пойдет прахом — и годы напряженной учебы, и здоровье, и нервы, и колоссальные материальные затраты государства на обучение...

Сложившимся положением с трудоустройством выпускников своего вуза обеспокоен и ректор Беларуского государственного университета информатики и радиоэлектроники Ильин В.М. Парадоксально, но факт. Если все же берут по распределению молодых специалистов, то тут же требуют от них справку о свободном трудоустройстве, тем самым лишая их льгот и ущемляя предоставляемые законом права.

Не скрывает свою боль и досаду директор Минского технологического техникума Гайдук А.М. по поводу всякого рода "новшеств" в среднем специальном образовании, платном обучении, ликвидации приема на обучение по специальности химическая чистка и крашение одежды. Из-за развала "бытовки" сложно с трудоустройством специалистов-фотографов, хотя это единственная группа в республике.

А что думают сами молодые? Вот цитата из научного отчета о результатах социологического исследования по теме: "Молодежная безработица: проблемы, перспективы, тенденции", подготовленного институтом социологии АН Беларуси и Минским городским центром занятости населения. Исследованием было охвачено 500 выпускников различных учебных заведений. Это примерно равные по численности группы: заканчивающие 9-й класс, выпускники 11-х классов, ПТУ, техникумов и вузов.

Практически все выпускники воспринимают безработицу как реальность сегодняшнего дня. Респонденты считают, что самые большие трудности испытывают инвалиды, лица, прибывшие из мест лишения свободы, и выпускники 9-х классов. У выпускников техникумов и вузов оптимизма не слишком много: они посвятили годы приобретению профессии, а попадают в зону риска на рынке труда. Наиболее обнадеживающая пока перспектива у выпускников ПТУ. Безработица до 3-х месяцев воспринимается пока достаточно терпимо, более длительная — резко негативно. Стабильно не популярен у молодежи неквалифицированный труд, равно как и уход за больными, престарелыми и детьми.

Интересна и еще одна сторона исследований. Она показывает, что молодые люди со временем становятся не только опытнее и зорче, они приобретают и новые жизненные ориентиры. В конце концов они поймут, что тот капиталистический пряник, которым их поманили, достанется небольшой кучке избранных, а в погоне за ним можно потерять и совесть, и разум, и душу свою. А основной вывод таков: молодые полагают, что проблемы трудоустройства молодежи и ее социальной защиты в значительной степени должны решаться государством. Необходимо принятие законов, специально регулирующих отдельные виды гибкой занятости (неполный рабочий день, временные работники по контракту). Нужно создать условия, чтобы молодежь могла реализовать свое право на труд и достойную жизнь.

У страны, не заботящейся о молодежи, нет будущего.

Тамара ВАСИЛЕВИЧ

Фото Е. ПЕСЕЦКОГО

Абразкі жыцця

Я — пісьменнік, а на хлеб надзённы зарабляю працай вахцёра ў Маладзечанскім гарвыканкаме, бо з пісьменніцкай працы ў пару суцэльнай дэмакратыі не пражыць нават класіку. У час дзяжурства даводзіцца сустракацца з цікавымі людзьмі, назіраць і смешнае, і грэшнае ў жыцці. Усё гэта я занатоўваў у блакнот. Асобныя замалёўкі з натуры прапаную чытачам "Цэнтральнай газеты".

Аўтар

НАТАТКІ ВАХЦЁРА

МІМІКРЫЯ

Няма таго вечара, каб у зале паседжанняў гарвыканкама не збіраліся на параду прадстаўнікі якой-небудзь партыі, таварыства, згуртавання ці суполкі. І на кожнай такой нарадзе абавязкова прысутнічае Пятро Пятровіч, бо ён кіраўнік аб'яднання ўсіх дэмакратычных суполак і партый Маладзечна. На ўсіх нарадах ён палка крытыкуе парламент, урад, заклікае да страйкаў. Асабліва ён ганіць на сходах былых партыйных наменклатуршчыкаў, якія пераселі з партыйных у дзяржаўныя крэслы. Часта чую я прамовы і ніяк не магу зразумець вось што...

Пятро Пятровіч сам былы наменклатуршчык, гадаванец камсамолу і партыі. Яна яго песціла, высоўвала на розныя пасады і, нарэшце, прызначыла дырэктарам буйнога завода. Ён і зараз ім кіруе. Цяпер Пятро Пятровіч і яго памагатыя ходзяць па горадзе і вывешваюць у вітрынах магазінаў здымкі катэджаў, якія пабудавалі сабе за горадам наменклатуршчыкі, якіх яны крытыкуюць. Але сярод іх не знойдзеш ні аднаго здымка двух катэджаў, якія Пятро Пятровіч пабудаваў сабе. І таксама ці за свае грошы?

Дык што яму яшчэ не хапае? Думаеце дэмакратыі? Яна яму і не трэба. Улады Пятру Пятровічу не хапае.

Апошнім разам бачыў я Пятро Пятровіча на Дзяды ля капліцы. Сюды гараджане прыходзяць памянуць нябожчыкаў. На гэты раз людзей было шмат. Пасля святара слова ўзяў Пятро Пятровіч. Ён заклікаў усіх верыць у Бога. Не парушаць хрыстовых запаветаў. Потым скончыў гаварыць, перахрысціўся тры разы.

І тут я раптам пачуў за спіной голас бабулі:

— Ганна, ці не той гэта антыхрыст, што некалі скідаў у Лебедзеве крыжы з царквы?

— Аняўжо ж, той самы.

— Выходзіць сатана таксама верыць у Бога?

— Ціха ты... Яшчэ пачуе. Тады дабра не чакай...

— А я нічога дрэннага і не сказала... Толькі думаю: моліцца, быццам Бог з ім адну партыйную школу канчаў.

СЛЁЗЫ

Яна прыбегла ўвечары ў выканкам задыханая і ўстрывожаная.

— Гуманітарную дапамогу сёння выдавалі? — яшчэ з парога нецярпліва спытала ў мяне. — З Германіі?

— З гаража адпускалі, — адказваю. — З двара. А цяпер гараж ужо зачынілі. Позна вы прыйшлі.

— А заўтра будуць выдаваць? — Жанчына нахілілася нада мною і пачала ўзірацца мне ў вочы. — Не разабралі яшчэ дапамогу?

— Не. Сёння ж толькі даставілі, — супакоіў жанчыну.

— А не ведаеце, што прывезлі?

— Не, не ведаю, — кажу я. — Не падыходзіў да гаража.

— Дык, можа, бачылі, што з яго людзі выносілі? — упарта дапытвалася жанчына. Яна ад нецярплівасці і хвалявання ніяк не магла стаяць на месцы, то адбягала ад майго вахцёрскага стала, то зноў, пакружыўшы па вестыбюлі, набліжалася да яго. — Курткі дзіцячыя, боцікі, каву давалі?

— Здаецца, усё гэта ўжо павезлі ў дзіцячы інтэрнат. У Радашковічы, — няўпэўна вымавіў я.

— Няўжо?!

Яе ледзь не схапіла памарака. Жанчына як стаяла так і апусцілася на табурэтку і раптам наўзрыд заплакала. Плакала горка і шчыра.

— Я даўно ведала, што будзе. Начальнікі нахапалі сваім дзецям, а простым людзям — дулю... Я адзінокая маці... Дзіця, мая Нінка, босая і голая ходзіць, а яны...

— Не гаруйце, вам ваша аддадуць. У спісе ж вы значыцеся?.. — суцяшаю маладую маці.

— Ага.

— Дык вас не пакрыўдзяць. Дарэмна плачаце. Прыходзьце заўтра раніцай і атрымаеце дапамогу...

Такія словы падзейнічалі на жанчыну. Яна выцерла хусцінкаю слёзы і цяпер ужо з надзеяй глядзела на мяне. Неўзабаве зусім супакоілася і выйшла за дзверы...

Неяк у нядзелю я падаўся на кірмаш, каб купіць бульбы. І для цікавасці зазірнуў пад паветкі, дзе гандлявалі вопраткай і абуткам. Раптам сярод гандлярак заўважыў тую маладую жанчыну, якая прыходзіла ў выканкам па гуманітарную дапамогу. Я спыніўся і пачаў разглядаць, што яна прынесла прадаваць. Але разгледзіць усё не паспеў, бо пачуў звонкі голас жанчыны:

— Купіце, дзядуля, сваёй унучцы боцікі. Нямецкія. Муж з Германіі толькі што прывёз!

Адразу, бачна, не пазнала мяне.

ПАЗАЛОЧАНАЯ РАМА

У горадзе рыхтавалася святочная выстаўка. Аддзел культуры гарвыканкама апавясціў мясцовых мастакоў, каб паказалі свае карціны для адбору.

Адзін мой знаёмы, якога гэтае мерапрыемства застала знянацку, пачаў чухаць патыліцу: няма, маўляў, нічога вартага. А тое, што ёсць, ужо шмат разоў выстаўлялася і набіла аскоміну. Думаў-думаў і, нарэшце, знайшоў у стосе старых эцюдаў нейкі даўно накіданы, нехлямяжы матыўчык і тэрмінова пачаў яго перапісваць фарбамі.

— Ну як? — спытаў ён, калі закончыў працу.

На мой погляд, эцюд не атрымаўся, нават быў горшы, чым раней. І я сказаў яму пра гэта.

Тады ён напілаваў шырокага, з далоню, багету з аздобаю пад знакамітую старасветчыну і абклаў ім няўдалую карцінку.

— А цяпер?

Ён глядзеў на мяне з надзеяй, а мне думалася, што і ў літаратуры іншы раз цьмяныя, невыразныя творы вось гэтак жа абкладваюць знакамітым багетам з усялякіх званняў і пасад. І вельмі часта праз некалькі гадоў у памяці застаецца адна толькі пазалочаная рама.

ВЫПАДАК НА КІРМАШЫ

Калі хто з нас, вахцёраў, захварэе ці пойдзе ў адпачынак, па тэлефоне выклікаюць Кузьміча, які жыве побач з выканкамам. Тады ён становіцца на вахту.

Яго, былога франтавіка, даўно залічылі б у вахцёрскі штат, але Кузьміч, на думку начальства, мае вялікі недахоп: ён выпівае.

І, што дзіўна, на вахце Кузьміча ніхто не бачыў п'яным. Прыняўшы вахцёрскі пост, ён адразу пераўвасабляецца, мяняе паводзіны, робіцца непрыступна строгім вартавым. Калі хто-небудзь з учарашніх сабутыльнікаў у гэты час заходзіць у вестыбюль і ківае Кузьмічу ў бок гастранома, надменны вахцёр круціць галавою:

— Нельга! — І шматзначна кажа. — Я на дзяржаўнай службе!

— Дык мы хуценька.

— Нельга! Я — пры тэлефоне. На баявым, можна сказаць, пасту!

Аднойчы раніцай, калі я закончыў начное дзяжурства і сабраўся ўжо ісці дамоў, раптам адчыніліся дзверы і з-за іх у вестыбюль высунулася нечая галава. Я сумеўся: твар у наведвальніка быў закарэлы, абадраны, брудная вопратка змятая, нібы чалавека прапусцілі праз малатарню.

— Кузьміч?! — жахнуўся я. — Дзе гэта цябе так?

Кузьміч знямогла прысеў на край табурэткі, адвярнуў у бок твар і прахрыпеў:

— Тратуар высклізнуў з-пад ног.

Гляджу падазрона на старога:

— А ці не хлусіш, Кузьміч?

— Кажу ж, "асфальтавую хваробу" падчапіў.

— Цябе ж толькі што з міліцыі выпусцілі.

— Адкуль ведаеш? — Кузьміч перапалохана зірнуў на тэлефон.

— Пазванілі?

— Не званілі. Але ўчора надвячоркам бачыў, як цябе бралі.

А здарылася вось што...

Стаю я ўчора на кірмашы, нібы ў разварушаным мурашніку. Цэны — на лоб вочы лезуць. Стаю, гадаю, што купіць: капусту на боршч або цыгарэты. На тое і другое грошай не хапае.

І тут бачу Кузьміча, які таўчэцца між людзей, кагосьці шукае. Раптам наблізіўся да сівога дзядзькі, упёрся вачыма яму ў твар:

— Што прадаеш, землячок?

— Ды вось стаю, — буркнуў той сам сабе пад нос.

— Не круці. — Кузьміча чамусьці біў калатун, быццам ён трымаў у руках адбойны малаток. — Што ў цябе — ордэн ці медаль?

Сівы расціснуў далонь, і я на момант убачыў ордэн колеру спелай вішні.

— А ў мяне медаль, — уздыхнуў Кузьміч. — "За адвагу". Праўда, па дурному атрымаў. Служыў, разумееш, у вайну кухарам. Неяк вёз абед на ўсю роту — лічы, суткі нічога не елі салдацікі! Тут немец і накрыў мяне мінаю. Кучна клаў, гад, быццам клёцкі сыпаў. Ну, думаю, хана! Вось-вось міна за каўнер упадзе. Коні панеслі мяне на фрыцавыя кулямёты. А галодная рота, ці паверыш, за мною папёрла, пагналася! Словам, перапудзілі немцаў. Самі з акопаў паўцякалі. Ротны пасля чыркнуў куды трэба, быццам я людзей падняў у атаку і вось, плясь табе, Пеця, медаль на грудзі! Прадаваць вельмі шкада, нават цяжка, але я не магу цвярозымі вачыма глядзець на цяперашнее паршывае жыццё.

— А я яшчэ свае ўзнагароды ў шаснаццаць гадоў сюды прышпіліў, — усміхнуўся з сумам і ляпнуў сябе па грудзях сівы. — Дапісалі з Васькам, сябрам маім, гады ў метрыкі, і — на фронт. Ордэн баявога Чырвонага Сцяга за вышыню атрымаў. Пасля шостай атакі. Снег вакол той вышыні мёртвымі шынялямі быў засланы, нібы хто на яго махоркі насыпаў. Васю забіла... Думаю цяпер: за што ваявалі? За Радзіму, за Сталіна? А Сталін бандытам аказаўся. Унучка ў мяне без паліто ў школу ходзіць... Вось і вырашыў...

— Як завуць цябе, зямляк? — спытаў Пятро Кузьміч.

— Антонам заві, калі ахвота.

— Дык вось, Антоша, пра што я зараз падумаў... Калі б нашыя аднапалчане, хто галаву паклаў на вайне, даведаліся, якім мы тут займаемся "стрыптызам", — у магілах перавярнуліся. Паднялася б зямля на дыбы ад Масквы да Берліна. Вось прадам медаль, і, глядзь, нейкая фуфыра намаляваная будзе насіць маю "адвагу" ў выглядзе завушніцы. Або пародзістаму сабаку хто медальён зробіць, каб матляўся на раменчыку.

— Па чым радзіму прадаем? — раптам убачыў я, што перад старымі выраслі, нібы з-пад зямлі, дзябёлыя хлопцы ў скуранках. — "Вовіка" маеце?

— Якога "Вовіка"? — недаўменна зірнуў на іх дзядзька Антон.

— Хіба не ведаеш? Ордэн с правадыром сусветнага пралетарыяту. Не жміся, за "зялёненькія" купім. А ты, алкаш, ліняй адсюль!

І яны адштурхнулі ў бок Кузьміча.

Сівы пабялеў, ні жывы, ні мёртвы, сунуў у рукі "скураному" ордэн. І плечы яго закалаціліся — страшна было глядзець збоку. Я перавёў позірк на Кузьміча. Той даваў па кірмашы кругаля, маленькі, згорблены і з шызым ад перапою тварам.

— Эх, ядрона маць, — пачуў яго хрыплы голас. — Мабыць, нікому не патрэбна мая "адвага". Хоць бы на бутэльку віна хто паспагадаў.

І раптам на кірмаш нібы наляцеў віхор, і Кузьміч закруціўся ў руках міліцыянераў. Але неяк злаўчыўся, вырваўся і ў імгненне вока прычапіў да сарочкі медаль, прыклаў далонь да брыля старой форменкі:

— Таварыш, сяржант! Герой Кёнігсберга...

Але яму не далі дагаварыць — моцныя рукі скруцілі Кузьміча і, нібы сучкаватае палена, шуганулі ў "варанок".

Я кінуўся было на выручку, але сяржант з такой сілай адапхнуў мяне ад машыны, што я ледзь утрымаўся на нагах.

— Не лезь, бо самога туды запіхну!

... І вось цяпер Кузьміч, адвёўшы позірк, сядзеў на табурэце і яго дробненькае, нібы вераб'інае, цела, сціснулася ад абразы і перапалоху... Было відаць, што чалавека паліў сорам за тое, што з ім здарылася на кірмашы. Пакрыўджаны і зганьбаваны, ён не ведаў, куды схаваць вочы.

Нарэшце павярнуў да мяне пашэрпаны твар.

— Ты, Фаміч, таго... нікому не кажы. Пра медаль і пра міліцыю... — Голас у старога задрыжэў: — От даваяваўся!

— А з медалём, Кузьміч, як? — пацікавіўся я. — Не адабралі?

— А трасца ім! — У яго вачах мільгнула кволая радасць. — Надзейна схаваў "адвагу".

Ён зняў з галавы форменку з паламаным брылём, пакалупаўся пальцамі пад аколышам, выняў адтуль медаль:

— Вось ён! Цяпер да смерці буду берагчы!

На далоні свяціў металёвы кругляшок, так і не згубіўшы бляску за доўгія гады.

Мікола КАПЫЛОВІЧ,
пісьменнік

Погляд з-за мяжы

Большинство наших соотечественников при словах "реальный социализм" скорее всего недоуменно пожмет плечами: о чем, дескать, рассуждать! Годы сделали свое дело, и теперь в сознании некоторых социалистическое общество ассоциируется с тоталитарным подавлением свободной мысли, а для большинства ---- с колбасой "навалом" по два девяноста и квартплатой по десять рублей в месяц за двухкомнатную с паркетом.

Но возможен и иной подход: при всем осознании ошибок и недостатков реального социализма постараться объективно оценить его роль и место в развитии человеческой цивилизации. И тогда, как это сделал германский востоковед и политолог Петер Линке, можно прийти к выводу: речь идет совсем не о некоем тупиковом пути развития человеческого общества (вспомните, ведь именно это нам всем усиленно доказывали все последние годы!), а о строе, вполне способном найти решение многих глобальных проблем.

Вниманию тех, кто хочет более подробно познакомиться с аргументами П.Линке, мы предлагаем его беседу в Берлине с журналистом Александром Степановым.

НА БЫВШЕМ РУБЕЖЕ

Размышления о тоталитаризме

— Справедливо сказано: никакие враги не сумеют нанести такого урона, какой по недомыслию способны причинить недалекие друзья, — начал разговор П.Линке. — Это полностью относится к тому, чем по сей день занимаются многие в России, и в ином случае демонстрируется тот образ мышления, которым "славились" преподаватели сети партийного просвещения: конструируется, а чаще просто заимствуется готовая книжная схема, а потом нещадно критикуется все, что в нее не вписывается. С высот сияющих теоретическим глянцем идеалов легко объявить неудачным, ошибочным, а то и преступным любой практический опыт.

На мой взгляд, этот голый критицизм свидетельствует об отсутствии исторического подхода. А потому особенно непонятно, когда о недостатках — подлинных и мнимых — реального социализма пространно распинаются те, кто именует себя левыми. Имею в виду прежде всего многих своих соотечественников, ударившихся под видом демократизации социализма в его криминализацию.

С пропагандистской точки зрения основная "криминальная" сторона социализма — тоталитарный характер этого общества. Услышав слово "тоталитарный", всякий записной демократ подпрыгнет до потолка: как же, тоталитарное подавление, гулаги, преступления сталинского режима и тому подобное. Но давайте вернемся к изначальному смыслу "тоталитарный", понимаемый как всеобщий, целостный. И тогда мнимый недостаток превратится в историческое преимущество.

— Уж не решили ли вы, Петер, произнести похвалу тоталитаризму? Боюсь, вам не стяжать на этом пути лавров Эразма Роттердамского, написавшего свою "Похвалу глупости".

— Ну, во-первых, тоталитаризм не глупость, а реально существующий принцип построения человеческого общества, и он отнюдь не обязательно должен приводить к тому, что все будут маршировать в одном строю, а репрессивный аппарат станет основой государства. А во-вторых, я имею в виду совсем другое.

Вспомните, что писал Анатолий Луначарский в "Великом перевороте". Для него революция была необходимым в своем трагизме моментом в мировом развитии человеческого духа к "вседуше", самым великим и решительным актом в процессе "богостроительства", самым ярким и решающим подвигом в направлении программы, формально удачно намеченной Ницше, — "в мире нет смысла, но мы должны дать ему смысл".

Это же ощущение того, что лишь революция может быть спасением от приближающегося глобального катаклизма, своего рода конца света, было характерно и для мыслителей многих других стран, в частности и для немцев. Тяга к тоталитарному, понимаемому как единое общественное дело, стала ответом на раздробленность общества двадцатого века. В социальном плане это выразилось в его классовой структуре, а в технологическом — в новых принципах общественного разделения труда.

Теперь, перейдя на российскую почву, я хочу заметить, что для первых послереволюционных лет было очень характерно прогрессистское течение, обожествляющее технику как средство решения социальных проблем. Вспомним хотя бы Гастева, Кириллова и их единомышленников. Да и в простых людях жила тогда вера в то, что трактор или электричество способны перевернуть их жизнь и пустить ее по новому руслу.

— Не могу не согласиться с вами. Каждый, кто читал литературные произведения тех лет, не может этого не заметить. Но вы произнесли одно важное слово — обожествление...

— Вот именно! Это уже действительно чисто русское сочетание божественного и земного, иррационального и рационального, сказочного и приземленного.

Однако давайте посмотрим, как сложилась судьба этих направлений мысли в послевоенную эпоху. В России продолжало развиваться реальное социалистическое общество, для которого в целом был характерен тоталитарный подход — в том смысле, в котором мы обсуждали выше.

А что же в Германии? Здесь развитие шло по двум разным направлениям, обусловленным самим существованием двух немецких государств. В ГДР шел процесс, который огрубленно можно было обозначить как советизацию. Я не вижу в этом ничего худого и, напротив, расцениваю это как своего рода цивилизованный подвиг.

— Погодите, погодите. Этот тезис вам придется разъяснить подробнее.

